ДА ЮБІЛЕЮ КЛАСІКА

Алена РУЦКАЯ

# АДАМ МІЦКЕВІЧ У ПАЛОТНАХ БЕЛАРУСКІХ МАСТАКОЎ

**«Зямля навагрудская, краю мой родны», – пранікнёна прамаўляў Адам Міцкевіч, у паэтычнай і чулай душы якога ніколі не згасала любоў да роднай зямлі. «Гэта зямля ўсё жыццё натхняла яго», – так пра Адама Міцкевіча напісаў Уладзімір Караткевіч да 170-годдзя паэта. А сёння каляндар пазначае ўжо яго 225-годдзе (24.12.1798). І гэта сведчанне ўшанавання высокага таленту і значнасці створанага паэтам.**

Але ёсць яшчэ адна важная ўласцівасць юбілейных дат – яна палягае ў іх інфармацыйным арэале, які нацэльвае на пошукі невядомага, новага і дазваляе звярнуцца да ранейшага, прыгадаць, пераасэнсаваць ці ўзнавіць многае для новага часу.

У гэтым рэчышчы актуалізуецца і зварот да інтэграванасці розных галін мастацтва, напрыклад, вытлумачваецца нязменная ўвага да асобы Адама Міцкевіча, яго паэтычнай спадчыны і лёсу творцаў другой галіны мастацтва – жывапісцаў. Палотны Н. Орды, М. Андрыёлі, В. Ваньковіча, І. Аляшкевіча, В. Дмахоўскага і інш. з'яўляюцца найбольш вядомымі, хрэстаматыйнымі. Ёсць нямала і пазнейшых, і сучасных беларускіх майстроў пэндзля, якія прысвяцілі свае карціны Міцкевічу. Эстэтычным прынцыпам вобразнага адлюстравання для іх становіцца духоўная еднасць з аб'ектам свайго вобразатвору, а яшчэ і лірыка-інтэлектуальнае бачанне, напрыклад, як у Уладзіміра Пасюкевіча. Мастацтвазнаўцы адзначалі, што мастак любіў паэзію Адама Міцкевіча, зачароўваўся свіцязянскімі краявідамі. Ён уважліва вывучаў усё, што захоўваецца ў Навагрудку ў музеі паэта. Стараўся гранічна дакладна ўявіць час, постаці, настроі. Менавіта так, з роздумам пра паэта, яго жыццё, стварае мастак партрэт Міцкевіча. Паэтычныя рысы вобразнага рашэння ў гэтым палатне набываюць асаблівую выразнасць, глыбіню пранікнення ў высокасць паэзіі, духоўны свет і жыццёвы лёс вялікага паэта.

Пасюкевіч не проста піша партрэт – ён увасабляе вобраз летуценны, меланхалічны, ахутаны легендай. Паказвае паэта ў раннія гады, калі той напісаў свае першыя творы. Пейзажны фон партрэта – гэта вобраз прыроды, якая так узрушвала, натхняла паэта:

Гушчар лесу пахне чаборам і мёдам,
Жывіцы настоем смалістым.
Там возера Свіцязь, як шыбіна мёду,
Ляжыць паміж дрэваў цяністых.

Гэты ж пейзаж, толькі намаляваны фарбамі адлюстраваны і на палатне. Постаць Міцкевіча напісана ў поўны рост. Паэт стаіць, прыпінаючыся да старога дрэва, якое ўваходзіць у зямлю моцнымі каранямі. Густы асенні лес залаціцца лістотай, цягнецца сцяной уздоўж берага, адлюстроўваецца ў вадзе. Асабліва тонка выпісана задуменнае аблічча паэта. У апушчанай руцэ – кніга, падаецца, нібы юнак толькі што чытаў яе, і зараз думкі, якія ўсхвалявалі яго душу, адлюстроўваюцца ў задуменных вачах, апавядаючы гледачу пра шчаслівыя хвіліны натхнення.

Вобраз узнёслага рамантыка, баладная паэзія навагрaдскіх мясцін, што жывіла яго творчасць, таленавіта перададзена і ў беларускай кніжнай ілюстрацыі.

Варта адзначыць, што яшчэ пачатак 80-гадоў вылучаюць як новую прыступку плённага развіцця беларускай кніжнай ілюстрацыі, калі мастакі ўсё больш сталі адыходзіць ад механічна-ілюстрацыйнага пераводу літаратурных вобразаў у выяўленча-зрокавыя. Хаця многім з іх нельга і сёння адмовіць у дасканаласці і нават запатрабаванасці, але вельмі вартасна, што наватарскія пошукі пачалі пераходзіць у рэчышча сатворчасці, набылі псіхалагічную глыбіню. У дачыненні да твораў Адама Міцкевіча новая канцэпцыя выявілася асабліва яскрава. Так адным з арыгінальных і надзіва пранікнёных ілюстратараў міцкевічаўскай паэмы стаў мастак-філосаф, графік, народны мастак і Заслужаны дзеяч мастацтва Беларусі Арлен Міхайлавіч Кашкурэвіч.

У 1976 годзе ў выдавецтве «Мастацкая літаратура» было запланавана выданне падарункавай кніжкі-мініяцюры «Свіцязянка» – паэмы Адама Міцкевіча на трох мовах: арыгінала, беларускай і рускай (пераклады А. Зарыцкага, А. Фета), у аснову якой пакладзена легенда аб свіцязянскіх вадзяных німфах.

Прадмовай да кніжкі ўзяты словы Якуба Коласа: «Радасна ўсведамляць, што любоў да творчасці народа і веданне яе прывілі Міцкевічу ў маленстве простыя людзі нашай добрай Навагрудчыны, што яго музу многія гады натхнялі беларускія азёры і лясы».

Рэдактар Алесь Бачыла з некалькіх кандыдатур ілюстратараў выбраў менавіта Арлена Кашкурэвіча.

Сам мастак згадваў, як настойліва і адказна авалодваў сакрэтамі пабудовы кніжнай кампазіцыі. Падказкай да творчай знаходкі сталі малюнкі А. С. Пушкіна на палях рукапісаў. Кашкурэвіч звярнуў на іх увагу, калі

перачытваў розныя матэрыялы, звязаныя з пецярбургскім перыядам біяграфіі Адама Міцкевіча. Такім чынам стылёвай формай ілюстрацыі было абрана ўнікальнае графічнае выражэнне. Танальную манеру мастак змяніў на лінеарны малюнак, лаканічныя вобразы-сілуэты з дакладна падмечанымі дэталямі. Да «Свіцязянкі» Кашкурэвіч стварыў 17 ілюстрацый. Усе яны выкананы ў тэхніцы чорна-белага малюнка тушшу з арыгінальнымі спалучэннямі блакітных плям, ліній, штрыхоў, сілуэтаў лінеарных дэталяў. Тут напоўніцу спраўджана думка Міхаіла Савіцкага, што выдатны ілюстратар – самы ўдумлівы чытач. Мастак дакладна здолеў улавіць і перадаць таямніча-трагічнае гучанне Міцкевічавага твора і адлюстраваць яго праз выяўленчую метафарычнасць, сінтэз пластыкі і прыгажосці. Вонкавая эскізнасць малюнкаў-мініяцюр, напоўненая экспрэсіўнай эмацыянальнасцю, выразна перадае кампазіцыйную рытміку, гранічна завостраную кульмінацыю сюжэта, шматгамны эмацыйны настрой і рамантычную яскравасць вобразаў.

Філігранныя лініі, якімі выпісаны сілуэт дзяўчыны, ствараюць уражанне загадкавасці і таямнічасці:

Хто аб красуні даведацца прагне,
   След не знаходзіць дзявочы:
То яна кветкай узыдзе на багне,
   То – знікне іскрай у ночы.

Напружаны настрой кульмінацыйных радкоў паэмы падкрэсліваюць дынамічныя штрыхі, расхрыстаныя лініі, блакітны мазок, што абцякае, як хваля, агорнуты адчаем твар хлопца, які забыў аб каханай, заварожаны звабнаю прыгажосцю німфы, і «імкнецца аслеплы на згубу ў глыбіні».

Як і заключныя строфы, апошняя ілюстрацыя напоўнена шчымлівым драматызмам: над віруючай плынню яшчэ бачны твары хлопца і дзяўчыны, застылыя перад страшным наканаваннем, а над імі халодная сінеча, як бездань, якая праз імгненне паглыне іх:

Пашчу сваю раскрывае прадонне,
   Кружыцца злосна віхура.
Дзеўчына з хлопцам у бездані тоне,
   Вецер галосіць панура.

Кожная з ілюстрацый уражваючая, эмацыйна напоўненая, арганічна спалучаецца з тэкстам і ў той жа час утрымлівае ўнікальны аўтарскі почырк і бездакорны густ, што і сёння надае гэтаму падарункаваму выданню (памерам 7 на 7 сантыметраў) несумненную каштоўнасць. Згадваецца афарыстычнае выказванне, што «Кнігі – гэта помнікі іх аўтарам». Бясспрэчна справядліва ў дачыненні да славутага Адама Міцкевіча. Але, відаць, не лішне было б дадаць – і мастакам-ілюстратарам за прачулае выяўленне створанага пісьменнікамі, як у Арлена Кашкурэвіча – за паэтычную ўзнёсласць графікі.

*Ніжэй глядзіце ілюстрацыі.*


Адам Міцкевіч
СВІЦЯЗЯНКА











Што там за хлопец з поглядам ветлым
Поруч са стройнай дзяўчынай
Крочыць павольна пад месяцам светлым
Берагам Свіцязі сіняй?



Кто этот юноша скромный, прекрасный,
Рядом с ним дева кто эта,
Идут по берегу Свитези ясной
В проблесках лунного света?





Jakiż to chłopiec piękny i młody?
Jaka to obok dziewica?
Brzegami sinej Świteziu wody
Idą przy świetle księżyca.



__Для даведкі__

**Алена Вітальеўна Руцкая** – пісьменніца, вучоны-метадыст, заслужаны настаўнік Беларусі. Нарадзілася ў 1950 годзе на хутары Дзякоўцы Шчучынскага раёна Гродзенскай вобласці. Закончыла філалагічны факультэт БДУ (1971). Працавала настаўніцай у СШ № 2 г. Слоніма, з 1993 па 2018 – у ГрДУ імя Янкі Купалы. Дыпламант міжнароднага фестывалю паэзіі ў Ерэване (1971). Узнагароджана нагрудным знакам «Выдатнік народнай асветы» (1982). У 1985 годзе была прынята ў Саюз пісьменнікаў СССР. А. В. Руцкая аўтар некалькіх зборнікаў вершаў, васьмі навукова-метадычных дапаможнікаў, а таксама больш ста навуковых артыкулаў па пытаннях выкладання літаратуры ў школе, некалькіх дзясяткаў нарысаў па краязнаўстве і літаратуразнаўстве. Лаўрэат IV абласнога конкурсу рукапісаў імя Цёткі (Алаізы Пашкевіч) у намінацыі «Публіцыстыка і краязнаўства».